**ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ**
**па правядзенні выбараў**
**у Каардынацыйную Раду III склікання**

# РАШЭННЕ
## па скарзе зацікаўленай асобы на рашэнне аб адмене рэгістрацыі выбарчага суб’екта

27 траўня 2024 года г. Варашава

Выбарчая камісія па правядзенні выбараў у Каардынацыйную раду III-га склікання (далей - Выбарчая камісія) ў асобах Алены Прыходзька (старшыні), Андрэя Атаманчука, Яраслава Бекіша, Дзмітрыя Лазавіка, Альвіны Мінгазавай і Алены Філатавай, разгледзеўшы на пасяджэнні скаргу зацікаўленай асобы – Аляксандра Азарава, лідара спісу кандыдатаў выбарчага суб’екта “Закон і правапарадак”, рэгістрацыя якога была адменена,

## ВЫЗНАЧЫЛА:

24 траўня 2024 года ў 15:48 (CET) на адрас Выбарчай камісіі пастуціла скарга на рашэнне Выбарчай камісіі аб адмене рэгістрацыі выбарчага суб’екта ад зацікаўленай асобы – Аляксандра Азарава, лідара спісу кандыдатаў выбарчага суб’екта “Закон і правапарадак”, рэгістрацыя якога была адменена.

Заяўнік просіць Выбарчую камісію ажыццявіць наступныя дзеянні: “*перагледзець сваё рашэнне і прыняць рашэнне ў адпаведнасці з усталяванымі правіламі каб тэрмінова аднавіць удзел нашага спісу №5 у выбарчай кампаніі*”.

У скразе заяўнікам выкладзены наступныя довады:

1. Выбарчы суб’ект “Закон і правапарадак” мае “*высокі ўзровень папулярнасці*” і, па словах заяўніка, “*займае трэцяе месца па папулярнасці сярод выбаршчыкаў*”. У пацвярджэнне прыкладзена графічная выява, падобная да апытання ў мэсэнджэры, якая, аднак, не дазваляе вызначыць наступнае: на якім рэсурсе, па якой спасылцы, у якую дату і час, сярод якой аўдыторыі праводзілася апытанне і ці праводзілася яно ўвогуле.

Заяўнік лічыць, што адмена рэгістрацыі выбарчага суб’екта “Закон і правапарадак” пазбаўляе значную частку грамадства права на дэмакратычнае волевыяўленне, значна ўплывае на вынікі выбарчага працэсу і пазбаўляе іншых чальцоў спісу быць абранымі, што парушае міжнародныя стандарты правядзення дэмакратычных выбараў.

2. Заяўнік сцвярджае, што рашэнне Выбарчай камісіі з'яўляецца неправамерным, паколькі "*Рэгламент і Палажэнне Каардынацыйнай Рады не прадугледжваюць магчымасць зняцця спісу з уделу ў выбарах па прычыне выкарыстання сродкаў зносін, такіх як чат-бот плана "Перамога". Камісія не мае правоў дзейнічаць у такім напрамку*".

3. Заяўнік лічыць, што праз неправамернан рашэнне Выбарчай камісіі выбарчы суб'ект "Закон і павапарадак" пазбаўлены права на свабодныя і дэмакратычныя выбары. На яго думку выкарыстанне чат-бота "План "Перамога" адпавядае патрабаванню пп. 8.2 пункта 8 Палажэння і з'яўляецца законным сродкам камунікацыі з выбаршчыкамі, які супадае з агульнапрынятымі міжнароднымі стандартамі.

4. Заяўнік сцвярджае, што рашэнне Выбарчай камісіі не мае юрыдычнага абгрунтавання і прынята "*на аснове асабістага меркавання і прэтэнзій да Аляксандра Азарава, што не адпавядае стандартам дэмакратычных выбараў*".

Вывучыўшы довады скаргі і іх аргументацыю, Выбарчая камісія выкладае наступныя высновы.

1. Папулярнасць выбарчага суб'екта не з'уляецца абставінай, якая прымаецца да ўвагі Выбарчай камісіяй пры разглядзе пытання аб наяўнасці парушэнняў Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду ад 31 сакавіка 2024 года (далей - Палажэнне).

Падставай для адмены рэгістрацыі выбарчага суб'екта "Закон і правапарадак" з'яўляюцца парушэнні Палажэння, якія былі агучаны на адкрытым пасяджэнні Выбарчай камісіі 23 траўня 2024 года з удзелам Аляксандра Азарава і змешчаны ў апублікаваным рашэнні ад 24 траўня 2024 года № 24/05/24-1.

Паколькі ў дадзеным довадзе заяўнікам не абвяргалася правамернасць рашэння Выбарчай камісіі, апошняя лічыць яго безгрунтоўным.

2. Насуперак сцвярджэнню заяўніка аб "адсутнасці магчымасці зняцця спісу з удзелу ў выбарах" – у адпаведнасці з пп. 4.9.2 пункта 4 Палажэння ў сферу кампетэнцыі Выбарчай камісіі ўваходзіць адмена рэгістрацыі выбарчых суб'ектаў у выпадках, прадугледжаных Палажэннем. Паводле пп. 7.2 пункта 7 Палажэння, рашэнне аб рэгістрацыі выбарчага суб'екта адмяняецца ў выпадку, калі ім не выконваюцца патрабаванні Палажэння.

Падставай для адмены рэгістрацыі выбарчага суб'екта "Закон і правапарадак" стала не "*выкарыстанне сродку зносін*", як сцвярджае заяўнік, а парушэнне ім патрабавання Мемарандума аб неабходнасці выканання мер бяспекі і абароны інтарэсаў грамадзян Беларусі, а таксама

этычных нормаў падчас правядзення агітацыі, у тым ліку правіл Этычнага Кодэкса Каардынацыйная рады.

Такім чынам, Выбарчая камісія не пагаджаецца з довадам заяўніка аб неправамернасці прынятага рашэння.

3. Што тычыцца трэцяга довада заўніка аб законнасці і адпавяданні міжнародным стандартам выкарыстання чат-боту “План “Перамога”, Выбарчая камісія адзначае наступнае.

Выбарчай камісіяй ўвыяўлены парушэнні артыкулаў 5, 7 Агульнага Рэгламента па ахове дадзеных (GDPR) пры рассылцы паведамленняў праз чат-бот “План “Перамога”, што ніяк не можа сведчыць пра законнасць дадзенага ўчынку і адпавяданні яго такому агульнапрынятаму міжнароднаму стандарту, як праву на недатыкальнасць асабістага жыцця, прадугледжанаму артыкулам 17 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах.

4. Выбарчая камісія не пагаджаецца з довадам заяўніка аб адсутнасці юрыдычнага абгрунтавання рашэння аб адмене рэгістрацыі выбарчага суб’екта. У прыватнасці, рашэнне змяшчае прававыя нормы, на якіх яно грунтуецца: Палажэнне – пп. 3.1, 3.2.5 пункта 3, п. 4.9.2 пункта 4, пп. 7.2 пункта 7, прэамбула, Дадатак 1 “Мемарандум аб неабходнасці выканання мер бяспекі і абароны інтарэсаў грамадзян Беларусі”; Этычны Кодэкс Каардынацыйнай рады – пп. 1.2.3 пункта 1; Агульны Рэгламент аб ахове дадзеных (GDPR) – артыкулы 5, 7).

Асабістыя меркаванні чальцоў Выбарчай камісіі адносна Аляксандра Азарава ва ўлік не прымаліся пры прыняцці рашэння – яно грунтавалася выключна на аснове непрадузятай і бесстаронняй ацэнкі ўчынку і ў адпаведнасці з нарматыўнымі актамі.

Такім чынам, Выбарчая камісія не лічыць слушнымі довады заяўніка аб неправамернасці прынятага рашэння аб адмене рэгістрацыі выбарчага суб’екта “Закон і правапарадак” і не бачыць магчымым здавальненне просьбаў, выкладзеных у скарзе. Кіруючыся падпунктамі 4.9-4.12 пункта 4 Палажэння, Выбарчай камісіяй

**ВЫРАШАНА:**

У здавальненні скаргі на рашэнне Выбарчай камісіі аб адмене рэгістрацыі выбарчага суб’екта, пададзенай зацікаўленай асобай – Аляксандрам Азаравым, лідарам спісу кандыдатаў выбарчага суб’екта “Закон і правапарадак”, рэгістрацыя якога была адменена – адмовіць.

Паведаміць заяўніку, што рашэнне Выбарчай камісіі можа быць паўторна абскарджана ў тэрмін 24 гадзіны з моманту яго атрымання.

Старшыня Выбарчай камісіі А. Прыходзька